# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

*1 (212) 26 студзеня 1994 года, серада*


## Навіны

### «Ураджайныя» дысертацыі

Надзвычай багатым для нашага універсітэта быў мінулы год на абароненыя дысертацыі. Так, вучоную ступень дактароў навук атрымалі 8 чалавек. Гэта Сцяпан Андрэевіч Мінюк (матэматыка), Леанід МікалаевічКівач (фізіка), Аляксандр Мікалаевіч Нечухрын (гісторыя), Уладзімір Аляксеевіч Тамсінаў, Яўген Уладзіміравіч Багданаў, Мікалай Уладзіміравіч Сільчанка (правазнаўства), Аляксандр Міхайлавіч Карабанаў (філалогія), Святлана Піліпаўна-Мусіенка (філалогія).

Кандыдатамі навук сталі у мінулым годзе аспіранты, якія навучаліся ў нашым універсітэце і іншых ВНУ. Сярод іх Т. Т. Кручкоўскі, В. В. Калюта і Г. М. Семянчук (гісторыя), С. А. Аляксандраў і С. К. Гарадзілін (фізкультура), А. М. Пятрушкевіч, Д. Р. Мышко (філалогія), Ю. К. Рахматаў, В. Ю. Лебедзь (фізіка).

Вучонае званне прафесара прысвоена Яўгену Паўлавічу Крамлёву з біялагічнага факультэта і Леаніду МікалаевічуКівачу.

**З. Наско,**
**загадчыца аспірантуры.**

### Было што паказаць

У нашым універсітэце адбыўся рэспубліканскі семінар «Новыя інфармацыйныя тэхналогіі ў выкладанні фізікі», на які сабраліся прадстаўнікі вышэйшых і сярэдніх навучальных установ. У яго рабоце прыняў удзел начальнік упраўлення агульнай сярэдняй адукацыі Міністэрства адукацыі Г. М. Пятроўскі. Вопытам распрацоўкі педагагічных праграмных сродкаў падзяліліся выкладчыкі БДУ, ГрДУ, БДПУ, БДПА і іншыя. Высокую ацэнку атрымалі распрацоўкі кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі нашага універсітэта.

Цікавай была праграма другога дня семінару ў школе-гімназіі № 30. Вырашана праводзіць такія семінары штогод.

### Ці ўмеем самастойна працаваць?

Як паведамлялася ўжо, у красавіку адбудзецца агульнаўніверсітэцкі навукова-метадычны семінар «Самастойная праца як звяно ў навучальным працэсе і навуковай дзейнасці студэнтаў».

На пасяджэнні аргкамітэта па правядзенню семінара вырашана ўключыць дадаткова для абмеркавання наступныя пытанні:

— Арганізацыя індывідуальнай працы са студэнтамі ў адпаведнасці з магчымасцямі і спецыфікай факультэтаў і яе эфектыўнасць.

— Праблемы арганізацыі самастойнай працы студэнтаў ва ўмовах пераводу выкладання на беларускую мову.

— Выкарыстанне ў навучанні відэатэкі і пакетаў прыкладных праграм.

Тэрмін падачы заявак і тэзісаў — да 1 лютага 1994 года.

Аргкамітэт звяртаецца да дэканаў факультэтаў, загадчыкаў кафедраў, выкладчыкаў дапамагчы правесці наступныя мерапрыемствы семінара:

— адкрытыя заняткі (па рашэнню кафедраў).

— стварэнне відэафільма (па прапанове кафедраў).

— круглы стол (у межах вызначанай тэмы).

З прапановамі звяртацца ў 404 п. галоўнага корпуса.

Запрашаем да ўдзелу ў семінары выкладчыкаў, аспірантаў, саіскальнікаў, студэнтаў 5-га курса універсітэта.

**АРГКАМІТЭТ.**



Экзаменацыйная сесія — гэта своеасаблівыя іспыты не толькі для студэнта, але і для выкладчыка. Не выпадкова ж кажуць у народзе «Што пасееш, тое пажнеш». Вось чаму так старанна рыхтаваўся да сустрэчы са сваімі вучнямі доктар юрыдычных навук Мікалай Уладзіміравіч Сільчанка з факультэта правазнаўства.

**На здымку** М. У. Сільчанка прымае экзамен па тэорыі дзяржавы і права.

ФОТА У. САРОКІНА.

## І прыйшла пара развітання...

З імем А. В. Бадакова звязаны два апошнія дзесяцігоддзі жыцця нашага універсітэта. Пры яго непасрэдным удзеле праходзіла станаўленне універсітэта, ператварэнне яго ў буйны навучальны і навуковы цэнтр Беларусі. Сёння Гродзенскі універсітэт ведаюць далёка за межамі рэспублікі. Кадры, якія рыхтуюцца ў нас, з поспехам працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі. Аляксандра Васільевіча паважаюць у калектыве за добразычлівасць, памяркоўнасць, жаданне аказаць дапамогу чалавеку.



...Але, як кажуць, жыццё ёсць жыццё. І прыйшла пара ісці на адпачынак, які зароблены сумленнай шматгадовай працай.

Вось чаму апошняе пасяджэнне Вучонай рады і было прысвечана гэтай не зусім ардынарнай падзеі. Выказаць словы павагі і ўдзячнасці Свайму Рэктару прыйшлі калегі, вучні, саслужыўцы. Адкрыў і вёў пасяджэнне першы прарэктар А. І. Васкабоеў. Ён цёпла адазваўся аб дзейнасці А. В. Бадакова як кіраўніка і вучонага, адзначыў яго добрыя чалавечыя якасці. А. І. Васкабоеў зачытаў віншаванне ад імя калектыву і ўручыў каштоўны падарунак — тэлевізар. Было зроблена паведамленне, што А. В. Бадакоў не парывае сувязі з універсітэтам — ён прызначаны прафесарам кафедры філасофіі і адначасова дарадцам рэктара на грамадскіх пачатках.

Намеснік міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь В. І. Стаўроў уручыў вінoўніку ўрачыстасці Ганаровую грамату Міністэрства і грашовую ўзнагароду.

Цёпла і сардэчна павіншавалі А. В. Бадакова ад імя сваіх калектываў дэкан біялагічнага факультэта прафесар Н. В. Паўловіч, загадчык кафедры псіхалогіі прафесар С. В. Кандрацьева, загадчык кафедры фізвыхавання дацэнт В. А. Максімовіч, загадчык кафедры музыкі дацэнт В. А. Місцюк, в. а. загадчыка аддзела міжнародных сувязей, маркетынгу і права Л. І. Баброўнік, начальнік вучэбнага аддзела Э. С. Ярмусік, метадыст НДС Н. В. Бабарыка, дырэктар бібліятэкі В. С. Станкевіч, дырэктар школы-гімназіі № 30 Р. І. Можджар, прадстаўнікі Інстытута біяхіміі, сельгасінстытута і іншыя.

Падзякаваць А. В. Бадакова за сумесную працу прыбыў дырэктар фірмы «Транслес» А. Беднарскі (г. Познань), які з´яўляецца заснавальнікам Рэкламнага агенцтва «УНІ-АРТ» у Гродне. У знак удзячнасці і працягвання далейшага супрацоўніцтва ён унёс першы ўклад у стыпендыяльны фонд універсітэта для студэнтаў, якія паспяхова вучацца.

Начальнік упраўлення адукацыі аблвыканкама А. С. Саўчык уручыў А. В. Бадакову Ганаровую грамату абласнога Савета народных дэпутатаў.

У слове ў адказ Аляксандр Васільевіч падзякаваў прысутных за кветкі, цёплыя словы, сказаныя ў яго адрас, і давер, які яму аказвалі ўсе гады. І хоць час расставання заўсёды непрыемны, А. В. Бадакоў, цяпер ужо былы рэктар, быў надзвычай спакойным і вясёлым. Ён выказаўся аптымістычна і па-мужчынску пранікнёна: «Я гляджу на сённяшні дзень як на звычайны рабочы дзень».

І гэта радуе, бо хацелася б, каб мы заўсёды заставаліся людзьмі, з павагай і чалавечнасцю адносіліся б адзін да аднаго, нягледзячы на пасады, званні і ступені. У наш нялёгкі час гэта, бадай, самае важнае.

**На здымку: у час урачыстасці.**

**Фота У. Сарокіна.**

## Студэнцкая педпрактыка

Усяго пяць гадоў назад адкрыўся на філалагічным факультэце новы кірунак — польска-беларускае і польска-рускае аддзяленне. З´яўленне яго было выклікана самім жыццём.

Пяць гадоў... Не такі вялікі адрэзак часу, але за ім крыецца штодзённая напружаная праца ў студэнцкіх аўдыторыях, дзе чытаюцца лекцыі выкладчыкамі нашага універсітэта і навучальных установ Польшчы. Крапатлівая работа ў бібліятэках і доўгачаканая літаратурна-лінгвістычная практыка ў Кракаве, Гданьску, Любліне, дзякуючы якой студэнты пашыраюць свае веды па польскай мове і літаратуры, знаёмяцца з гісторыяй і культурай краіны, мову якой яны вывучаюць.

І нарэшце — вельмі адказны момант вучэбна-выхаваўчага працэсу — педагагічная практыка ў школах.

Педагагічная практыка — гэта не толькі адказны, але і вельмі хвалюючы момант у жыцці студэнтаў. Размеркавалі іх у сямі школах г. Гродна, у СШ в. Ласосна і, што вельмі прыемна, для нас, выкладчыкаў, 5 студэнтаў былі запрошаны для праходжання практыкі ў свае былыя школы Гродзенскай вобласці.

І вось я на ўроку ў 8«Б» класе школы № 10. Вядзе Андрэй Клімовіч, цікава гучыць расказ аб творчасці Марыі Канапніцкай. Вучні чытаюць вершы паэткі. Студэнт трымаецца ўпэўнена, добра валодае польскай мовай, стараецца актывізаваць клас, ставіць цікавыя пытанні. Складаецца ўражанне, што гэта не першы ўрок студэнта.

Надоўга запомняцца вучням эмацыянальныя, захапляючыя ўрокі Вольгі Курловіч. Старанная, дапытлівая і далікатная, яна і да вучняў ставіцца з разуменнем. Каб зацікавіць іх, выкарыстоўвае на занятках разнастайныя метады і прыёмы працы, шмат займальнага матэрыялу, нагляднасці.

Уважліва, з вялікім захапленнем слухаюць вучні Юру Гуменюка, а як жа, настаўнік ды яшчэ і паэт, піша вершы на беларускай і польскай мовах, арганізаваў сустрэчу з рэдактарам часопіса «Чароўнае падарожжа», з якім ён супрацоўнічае. Вучні задавалі пытанні, атрымалі ў падарунак першыя нумары гэтага часопіса. Таямніча гучыць легенда аб горадзе Гродна, якую расказвае вучням Жана Сільвон, вельмі старанная, добрасумленная студэнтка.

А як прыветліва сустракаюць у школе вёскі Ласосна Іну Жыдко, якая ўжо ў мінулым годзе вяла там заняткі, і вучні паспелі яе палюбіць.

Цікава праводзілі студэнты і выхаваўчыя мерапрыемствы: пабывалі з вучнямі ў тэатры, наведалі заапарк, а пасля правялі цікавыя гутаркі, падпарадкоўваючы іх галоўнай мэце: развіццю мовы вучняў, узбагачэнню польскай лексікі.

(Працяг на 4-й стар.).

# Сесія, сесія...

Студзень для студэнтаў — месяц бяссонных начэй, хваляванняў, радасці і... засмучэння. Бо сесія — непрадказальная пара. Рыхтуешся, здаецца, усё ведаеш, а на «выдатна» не заўсёды дацягваеш.

Але тым не менш студэнт заўсёды застаецца студэнтам, ён з любога становішча знаходзіць выйсце. Сёлетняя сесія, якая для многіх ужо скончылася, паказала, што большасць студэнтаў і стацыянара, і завочнікі атрымалі трывалыя веды і прыемныя адзнакі.

Наш фотакарэспандэнт Уладзімір Сарокін зрабіў гэтыя здымкі на III курсе **інжынернага** факультэта.

**На здымках:** экзамен прымае М. В. Карнавухаў; у час падрыхтоўкі да экзамена.





# Міжнародныя кантакты

**Міжнародныя эканамічныя сувязі ў нашым універсітэце разглядаюцца як адзін з важнейшых напрамкаў удасканалення падрыхтоўкі кадраў, аптымізацыі навуковых даследаванняў, абмена вопытам у навучанні і выхаванні студэнтаў. Пытанні ўдасканалення міжнародных сувязей разглядаліся на пасяджэнні Вучонай рады універсітэта, рэктарата.**

**Прапануем вашай увазе гутарку з Л. І. Баброўнік, якая зараз выконвае абавязкі начальніка аддзела міжнародных сувязяў, маркетынгу і права, аб дасягненнях і планах на будучае ў галіне развіцця міжнародных кантактаў.**

**— Міжнародныя эканамічныя сувязі адыгрываюць важную ролю ў жыцці універсітэта: я ведаю, што наладжаны кантакты Рэспублікі Беларусь з Рэспублікай Польшча, іншымі краінамі. Што робіцца ва універсітэце ў гэтым напрамку?**

— У мінулым годзе Гродзенскім універсітэтам імя Я. Купалы быў падпісаны шэраг доўгатэрміновых дагавораў аб навуковым супрацоўніцтве з замежнымі партнёрамі. 11 факультэтаў і 18 кафедраў з'яўляюцца непасрэднымі выканаўцамі рабочай праграмы навукова-дыдактычнага супрацоўніцтва паміж ГрДУ і філіялам Варшаўскага універсітэта ў Беластоку. Праводзяцца сумесныя даследаванні з Вышэйшай педагагічнай школай г. Кракава, Люблінскім, Гданьскім, Познаньскім, Варшаўскім універсітэтамі, Беластоцкай школай бізнесу.

Праграмай дагавору аб дружбе і супрацоўніцтве паміж РП і РБ прадугледжваецца прапаганда беларускай культуры ў РП, удасканаленне выкладання беларускай мовы ў Польшчы і польскай мовы ў Беларусі, абмен вопытам у галіне адукацыі і асветы, аказанне дапамогі ў стварэнні Беларускага дзяржаўнага навукова-дыдактычнага паланісцкага цэнтра на базе кафедры польскай філалогіі і г. д.

**— Лілія Іванаўна, раскажыце, калі ласка, як ажыццяўляецца супрацоўніцтва паміж студэнтамі і выкладчыкамі нашага універсітэта і замежнымі калегамі?**

— На філалагічным, факультэце беларускай філалогіі і культуры, гістарычным, матэматычным, фізічнай культуры, педагогікі і методыкі пачатковага навучання, факультэце правазнаўства (аддзяленне міжнародных эканамічных адносін) навучаецца 21 польскі студэнт.

Для чытання курсаў і спецкурсаў для гродзенскіх студэнтаў былі запрошаны прафесары Х. Бурштыньска, А. Беднарчук, дацэнт А. Спульнік (Вышэйшая педагагічная школа г. Кракаў), прафесар М. Кандрацюк (філіял Варшаўскага універсітэта ў Беластоку). Прафесар, доктар філалагічных навук П. У. Сцяцко выязджаў у РП для чытання спецкурсаў студэнтам усходнеславянскай філалогіі філіяла Варшаўскага універсітэта ў Беластоку.

90 студэнтаў-філолагаў праходзілі літаратурна-лінгвістычную і педагагічную практыку ў Вышэйшай педагагічнай школе г. Кракава, Гданьскім, Люблінскім універсітэтах, 8 студэнтаў гістарычнага факультэта прайшлі ў Беластоку навукова-даследчую практыку, а студэнты з Польшчы практыкаваліся ў нас.

**— Ці падтрымліваюцца універсітэтам адносіны з ВНУ іншых краін свету?**

— У рамках міжнароднай праграмы «Тэмпус» Камісіяй Еўрапейскай садружнасці ўстаноўлены партнёрскія адносіны з групай школ ЕСІДЕК (міжнародная камерцыйная школа ў г. Метцэ, Францыя), устаноўлены сувязі з удзельнікам праграмы «Тэмпус» прафесарам Эф. Маркюэс з Партугаліі, у галіне навукі і адукацыі з каледжам Роберта Морыса (ЗША). Амерыканская асацыяцыя юрыстаў сумесна з Цэнтральнай Усходняй Еўрапейскай арганізацыяй аб'яднала факультэты правазнаўства розных ВНУ, у тым ліку і факультэт правазнаўства ГрДУ. Запланавана стажыроўка дэканаў правазнаўчых факультэтаў у ЗША у 1994 годзе.

Працягваюць актыўна супрацоўнічаць з ВНУ замежных краін выкладчыкі, студэнты, аспіранты інжынернага факультэта. У выніку сумесных даследаванняў з замежнымі спецыялістамі мадэрнізаваны план спецыяльнасці «Аптычныя прыборы і сістэмы», праводзіцца распрацоўка планаў новых спецыяльнасцей. Дацэнт А. М. Арцюховіч, які стажыруецца ў Вірджынскім універсітэце (ЗША) правёў два лабараторныя практыкумы са студэнтамі-амерыканцамі, надрукаваў адзін артыкул і падрыхтаваў да друку яшчэ 3, у 1994 г. прадугледжваецца абарона дысертацыі на саісканне ступені доктара філасофіі.

На базе кафедры прыкладной оптыкі адбыўся II Міжнародны сімпозіум «Фізічныя прынцыпы і метады аптычнай апрацоўкі інфармацыі».

Некалькі выкладчыкаў знаходзіліся на навуковай стажыроўцы за мяжой: ст. выкладчык кафедры польскай мовы і культуры Т. Бялоцкая — у Кракаве, асістэнт кафедры біялогіі А. Вінчэўскі — у Бельгіі, асістэнт кафедры інжынерна-тэхналагічнай падрыхтоўкі Э. Сцефановіч — у Беластоку, прафесар С. Струміла — у Беластоку.

Плённае супрацоўніцтва ў галіне эканамічнага навучання ўстаноўлена з Міжнародным камітэтам па малому бізнесу (ЗША), Цэнтрам развіцця прадпрымальніцтва (ЗША). Вучоныя з ЗША на працягу 1993 г. чыталі курс лекцый па маркетынгу, менеджменту і прадпрымальніцтву на факультэце правазнаўства, праводзілі дзелавыя гульні і практыкумы. Аказана метадычная дапамога вучэбнымі дапаможнікамі і камп'ютарнымі праграмамі.

Сумесна з фірмамі з Польшчы універсітэт здзяйсняе падрыхтоўку сакратароў-рэферэнтаў і манекеншчыц, працягвае дзелавыя зносіны з Беластоцкім спартыўным клубам «Падлессе» на базе універсітэта. Праводзяцца міжнародныя спаборніцтвы па вольнай барацьбе, тэнісу, баскетболу.

**— Такім чынам, мы падвялі некаторыя вынікі. А якія планы універсітэта і вашага аддзела на гэты год?**

Плануецца выданне ў Беларусі часопіса «Сучасная замежная школа», а таксама дайджэста найбольш цікавых артыкулаў па ўдасканальванню за мяжой вучэбна-выхаваўчага працэса і аптымізацыі навуковых даследаванняў. Мы падключаемся да падрыхтоўкі матэрыялаў. Неабходна тэрмінова ўвесці ў штатны расклад пасады перакладчыкаў. Патрэбен больш патрабавальны падыход пры тэсціраванні грамадзян Рэспублікі Польшчы, выпускнікоў беларускіх школ і ліцэяў, накіраваных на вучобу ва універсітэт.

Мэтазгодна каардынацыя на рэспубліканскім узроўні выпуску вучэбна-метадычнай літаратуры, неабходнай для падрыхтоўкі замежных студэнтаў.

Праводзіцца работа па стварэнню беларуска-амерыканскага Вышэйшага бізнес-каледжа, заснавальнікамі якога выступяць разам з універсітэтам некаторыя вышэйшыя навучальныя ўстановы ЗША.

**Інтэрв'ю правяла НАТАЛЛЯ БЕДЗЬ.**

● Давайце разбярэмся

# АБВІНАВАЧВАЮЧЫ— АДХІЛЯЕМ?

**Чым выразней прарысоўваецца карціна барацьбы прыхільнікаў і праціўнікаў сацыялістычнага выбару ў былым СССР, тым яскрава выяўляецца, што ў ліку галоўных мішэняў у тых, хто «супраць»,— У. І. Ленін. Нямала былых алілуйшчыкаў ужо праявілі сябе на ніве хлуслівага ганьбавання вялікага — як прызнана ў свеце — рэвалюцыянера і ўсяго таго, што з ім звязана. Не толькі справу Ільіча (не гаворачы аб ідэях і тэорыі), але і цела збіраюцца «перазахаваць» на неіснуючым «завяшчанні» «вялікага памёршага». Зразумела і тое, што некаторыя людзі на першых парах даверыліся той інфармацыі, якая была выліта на Ільіча ў «незалежным» друку. Але, думаецца, сітуацыя, якая склалася вакол яго прозвішча, у многім абумоўлена аб'ектыўнымі прычынамі.**

Жыццёвы шлях некалькіх пакаленняў савецкіх людзей быў натхнёны вобразам правадыра пралетарыяту. Мы сталелі разам з ім, праходзячы праз «ленінскія ўрокі», «ленінскія пакоі», «ленінскія аўдыторыі», «ленінскія суботнікі».

Улады не шкадавалі сіл і сродкаў на ўзвядзенне помнікаў і мемарыялаў. Каменная ці бронзавая фігура Ільіча стала неадменным атрыбутам гарадскога ці сельскага пейзажу ва ўсіх кутках былога СССР.

Любая ўлада, якая ўсталёўвалася ў краіне, тут жа ўголас абвяшчала аб сваёй вернасці ленінскім запаветам. Кожны чарговы выгін ці перагіб «генеральнай лініі» у момант падмацоўваўся і апраўдваўся — чаго толькі не знойдзеш пры жаданні ў шматтомным Поўным зборы сачыненняў — адпаведнай ленінскай цытатай.

Перабіранне меры ў прапагандысцкіх намаганнях прывяло да вынікаў, адваротных жадаемым, пачало выклікаць пачуццё перанасычанасці і нават адварочвання. Як і заўсёды ў такіх выпадках, пачаў спрацоўваць аб'ектыўны закон масавай псіхалогіі: тое, што ўзносіцца да нябёс афіцыйным вучэннем, зніжаецца да грэшнай зямлі і здзекліва парадыруецца народным усведамленнем. Таму невыпадкова з'яўленне ў процівагу дзяржаўнаму славаслоўю шматлікіх анекдотаў, кашчунскіх і святатацкіх з пункту гледжання ўлад у недалёкім мінулым.

Бясспрэчна, дыскрэдытацыя сацыялізма ў вачах многіх людзей з'явілася вынікам рэальнай, у тым ліку і злачыннай, практыкі яго здзяйснення. Ленін да гэтага прамога дачынення не меў. Але, як сімвал сацыялізма, ён пацярпеў больш за ўсё.

Мне ўяўляюцца мітуслівымі, вельмі ілюзорнымі спробы перакрэсліць самую сацыялістычную ідэю. Не будзем спасылацца на Леніна, але нагадаем выказванне яго выдатнага апанента вядомага рускага філосафа М. А. Бярдзяева. «... Рух да сацыялізму — сацыялізму, які разумеецца ў шырокім, не дактрынёрскім сэнсе,— ёсць сусветная з'ява».

Ні для каго не сакрэт, што на прасторах СНД ідзе зараз барацьба за ўладу. Тыя, каму з Леніным не па дарозе, добра разумеюць, што спадзявацца на яго нейтралітэт не прыходзіцца. Затое яны спадзяюцца, што безадказнага Леніна можна змяць, зганьбаваць, нейтралізаваць.

Канешне, многім яшчэ трэба ўважліва ўглядзецца ў твары тых, хто імкнецца вымараць імя Леніна з гісторыі краіны і чалавецтва, хто хоча вырасці за кошт прыніжэння Леніна. Параўнаць іх з вобразам Ільіча. Зрабіць свой выбар.

Не маючы нічога агульнага з іканапісным вобразам, Ленін быў плоццю ад плоці народа, жыў клопатамі, спадзяваннямі людзей. Аднойчы стаўшы на шлях рэвалюцыйнага служэння народу, ён ніколі, ні пры якіх абставінах з гэтага шляху не звярнуў. Разам з тым, гэта служэнне не было патаканнем масам, іх недахопам і слабасцям, якія дасталіся ім у спадчыну ад былога ладу.

Шырока вядома ленінская бескампрамісная прынцыповасць і патрабавальнасць як да авангарда рабочага класа, так і да працоўных мас. Тут пачатак ленінскай нецярпімасці да бюракратызму, нацыянальнаму нігілізму, падмене дэмакратыі гульнёй у яе.

Дзейнічаючы ў складаных гістарычных умовах, ва ўмовах бязлітаснай класавай барацьбы, грамадзянскай вайны, У. І. Ленін асабліва паслядоўна выступаў супраць тых, хто ўстаў на шлях барацьбы супраць Савецкай улады, спрабаваў ліслівасцю, прыгожай фразай закалыхаць пралетарыят, адвесці яго ад вырашэння важнейшых задач, раззброіць яго ідэйна, растаптаць, знішчыць фізічна. Такой была логіка барацьбы, з аднаго боку, класа, які стагоддзямі панаваў над мільёнамі бяспраўных рабоў, з другога — пралетарыята і сялянства, зразумеўшых сваю чалавечую годнасць і паўстаўшых супраць спрадвечных прыгняталынікаў. Між тым, спекулюючы на дакументах часоў грамадзянскай вайны, наваяўленыя «заступнікі» народа хочуць абвінаваціць Леніна ў прыналежнасці да стварэння рэпрэсіўнай сістэмы, развязванню насілля. Але калі паглядзець праўдзе ў вочы, то нельга не ўбачыць, што пускаемыя ў ход інсінуацыі не больш чым спроба ўсё скінуць з хворай галавы на здаровую. Вядома, што пануючыя колы ў Расіі стагоддзямі культывавалі насілле над народам. Ва ўмовах прыгонніцтва працвіталі цялесныя пакаранні, нормай яны былі і ў царскай арміі. Ці не «воле-выяўленнем» працоўных патрэбна лічыць «крывавую нядзелю» 1905 года, ліпеньскі расстрэл у Петраградзе ў 1917 годзе, іншыя сведкі насілля?

Што б сёння ні казалі аб «аксамітавых» і «пяшчотных» рэвалюцыях, як бы захоплена ні крычалі аб жнівеньскіх, а тым больш кастрычніцкіх барыкадах у Маскве, рэвалюцыі і перавароты былі і застануцца жорсткімі і бязлітаснымі. Змена гаспадарчага ўкладу, прыход да ўлады новага класа — заўсёды былі нацыянальнай, калі не сусветна-гістарычнай трагедыяй. Яна тым больш страшэнная, калі прыходзіць да ўлады клас, клан ці слой людзей, сэнс улады якіх у аграбленні большасці народа. Бязлітаснасць тут двухбаковая. Прыходзячыя да ўлады будуць ісці да канца, абараняючы сваё права на аграбленне. Жабрацкая большасць будзе змагацца да канца за свой кавалак хлеба, сацыяльную абароненасць і элементарныя правы.

**(Працяг на 4-й стар.).**

